# Патрыярх гродзенскага краязнаўства

***У Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф. Карскага адбылася прэзентацыя новай кнігі Аляксея Пяткевіча «Слова і кніга Прынёмання». Яе аўтар – беларускі літаратуразнаўца, крытык, культуролаг, краязнаўца, педагог. Мы ганарымся, што Аляксей Міхайлавіч з'яўляецца даўнім сябрам нашай бібліятэкі, а чытачом – з 1957 года. Чалавек з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, інтэлігент найвышэйшай пробы – гэтыя якасці заўсёды вылучалі і вылучаюць яго. Таму не дзіўна, што прэзентацыя кнігі адбылася ў межах творчага праекта «Яны ўзбагацілі культуру Гродзеншчыны», ініцыяванага нашай бібліятэкай, і акурат у дзень 85-годдзя аўтара.***

Выданне «Слова і кніга Прынёмання» – гэта зборнік навуковых артыкулаў аб станаўленні і развіцці рукапіснага пісьменства, друку і літаратуры на гарадзенскіх землях. На старонках кнігі аўтар адлюстраваў гісторыю друку на Гродзеншчыне ў XVII – XVIII стст., у міжваенны перыяд. Аўтар прадставіў звесткі больш чым пра 600 творчых асобаў – літаратараў і журналістаў. Дакладныя і змястоўныя характарыстыкі герояў прыцягваюць увагу да знаёмых і незнаёмых прозвішчаў беларускай літаратуры і друку, і не толькі беларускай! Новая кніга змяшчае інфармацыю пра ўсіх пісьменнікаў, творчыя і жыццёвыя пуцявіны якіх знітаваныя з Прынёманнем: польскамоўных, рускамоўных і творцаў на ідыш.

Павіншаваць Аляксея Міхайлавіча з новай кнігай і з юбілеем сабралася вялікае кола навукоўцаў, творцаў, дзеячаў культуры і мастацтва. Першымі чытачамі новай кнігі сталі беларускія літаратуразнаўцы Ігар Жук, Ала Петрушкевіч, Святлана Тарасава, якія раскрылі навуковы падыход і грунтоўнасць выдання для вывучэння гісторыі культуры рэгіёна. А. Петрушкевіч падкрэсліла фундаментальнасць новага выдання і назвала яго «энцыклапедыяй літаратурнага, культурнага жыцця Гродзеншчыны». Чырвонай ніткай у выступленні І. Жука, прафесара Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, прайшла думка аб тым, што «кожная кніга Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча – адкрыццё». С. Тарасава адзначыла, што для аўтара кнігі характэрнае валоданне словам і адчуванне чужога слова.

Нарадзіўся А. Пяткевіч у мястэчку Новы Свержань на Стаўбцоўшчыне. Роднаму мястэчку Аляксей Міхайлавіч прысвяціў эсэ «Бацька мой Нёман» – споведзь пра родны кут, пра сваю сям'ю. Бацька Міхаіл Антонавіч паходзіў з сям'і дробнага службоўца на чыгунцы, маці Антаніна Уладзіміраўна – з сям'і рамесніка. Зарабляць на хлеб з малых гадоў даводзілася і дзецям, Алёшу таксама не абмінуў наканаваны многім незаможным местачкоўцам лёс пастушка. Менавіта ў такіх звычайных сем'ях растуць працавітыя дзеці, якія з ранняга дзяцінства ведаюць, што ў жыцці трэба разлічваць у першую чаргу на ўласныя сілы. У Новым Свержані Аляксей адразу ж наступіў у другі клас польскай сямігодкі, бо чытаць і пісаць па-беларуску і па-польску навучыўся самастойна.



А. Пяткевіч



А. Петрушкевіч

У нарысе «З пройдзенага» Аляксей Міхайлавіч пісаў: «*У 1957 годзе я трапіў у Гродна. З тае пары прайшло, па сутнасці, цэлае жыццё ў горадзе над Нёманам. Я тут не проста прыжыўся. Я стаў гродзенцам, для якога кожная драбніца старых вуліц і вулачак, унікальных помнікаў архітэктуры, старажытных каштанаў і ліпаў значная і дарагая*».

Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і аспірантуры пры ім, пасля прэстыжнага размеркавання – у Інстытут літаратуры Акадэміі навук – Аляксей Міхайлавіч адмаўляецца ад надзейнай навуковай кар'еры і едзе чытаць лекцыі студэнтам ў Гродзенскім педінстытуце. Працы там яму далі ўдосталь: лекцыі, практычныя заняткі, педагагічная практыка. Працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры літаратуры, з 1968 года ўзначальваў кафедру беларускай літаратуры. Аляксей Міхайлавіч быў ініцыятарам стварэння пры ўніверсітэце першай у краіне кафедры беларускай культуры, дзе спачатку працаваў дацэнтам, а потым і ўзначаліў яе. З 2006 года – працаваў на кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму, якая з 2013 года стала кафедрай турызму і культурнай спадчыны.

У 1994 годзе А. Пяткевіч стаў прафесарам. Перад гэтым яго навуковыя працы праходзілі экспертызу ў Інстытуце сусветнай літаратуры імя Максіма Горкага, Аляксей Міхайлавіч чытаў адкрытую лекцыю ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Прафесар Пяткевіч – фігура аўтарытэтная сярод калегаў і студэнтаў не толькі Гродзенскага ўніверсітэта, але і іншых універсітэтаў Беларусі і суседніх краінаў.

Першая літаратуразнаўчая публікацыя Аляксея Міхайлавіча з'явілася ў 1958 годзе – у часопісе «Полымя» быў змешчаны артыкул «Майстэрства партрэтнай характарыстыкі». У Саюз пісьменнікаў СССР А. Пяткевіч быў прыняты па рэкамендацыях Васіля Быкава і Данўты Бічэль у 1971 годзе як крытык і літаратуразнаўца. У яго навуковым багажы – 8 асобных кніг, 5 кніг у суаўтарстве, больш за паўтысячы артыкулаў. Якраз у Гродне А. Пяткевіч напісаў першую кнігу пра творчыя здабыткі Кузьмы Чорнага, а яшчэ раней абараніў па гэтай тэме кандыдацкую дысертацыю.

Зямлі, якая стала другой Радзімай, Аляксей Міхайлавіч прысвяціў даведнік «Людзі культуры з Гродзеншчыны», падобных якому ў іншых рэгіёнах няма. У ім аўтар раскрыў біяграфіі каля 600 ураджэнцаў рэгіёна – мастакоў, пісьменнікаў, архітэктараў, вучоных-гуманітарыяў. Што адметна, пра многіх людзей, згаданых у гэтай кнізе, маўчаць нават энцыклапедыі. Акрамя гэтага выдання было яшчэ адно краязнаўчае даследаванне – «Літаратурная Гродзеншчына: Мясціны. Людзі. Кнігі», якое выйшла ў 2000 годзе. Грамадская і нацыянальная руплівасць вывела вучонага на ніву літаратурнага краязнаўства. Можна ўзгадаць яшчэ два выданні: «Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне» (2002) і «Старонкі спадчыны. Культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы» (2006).

Нельга не адзначыць плённае супрацоўніцтва прафесара з выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» і яго ўдзел ў падрыхтоўцы і выданні гістарычных раённых хронікаў «Памяць». Варта падкрэсліць: хто б і якім аспектам у вывучэнні культуры, літаратуры і мастацтва Гродзеншчыны, ды і ўвогуле гродзенскай рэгіяналістыкі, ні займаўся, без кніг А. Пяткевіча не абысціся. Супрацоўнікі нашай бібліятэкі ганарацца, што яго выданні захоўваюцца і выкарыстоўваюцца ў бібліятэках не толькі нашай краіны, але і Масквы, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Любліна, Кракава.

Аляксей Міхайлавіч заўсёды ў віры культурна-грамадскага жыцця. Ён узначальвае гарадское аддзяленне Таварыства беларускай мовы. Шаснаццаць гадоў на гродзенскай студыі тэлебачання рыхтаваў і вёў штомесячную праграму «Кнігарня». А. Пяткевіч – пастаянны ўдзельнік шматлікіх навуковых і культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў як у нашым рэгіёне, так і на ўзроўні краіны. Мы ганарымся тым, што знаны даследчык удзельнічае ў Гродзенскіх навуковых чытаннях.

Сутнасць асобы Аляксея Міхайлавіча вельмі дакладна раскрываюць радкі з верша Ларысы Геніюш:

*Адзінай мэты не зракуся,*
*І сэрца мне не задрыжыць:*
*Як жыць –*
*дык жыць для Беларусі.*
*А без яе зусім не жыць.*

*Любоў ТУРМАСАВА,*
*загадчык аддзела краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага*

*Фота бібліятэкара аддзела краязнаўства Тамары ДАРАШКЕВІЧ*